Радыё Свабода

18.08.2019

# 9 самых незвычайных бібліятэк свету. У тым ліку Мінская

**Бібліятэкі − перажытак мінулага? А вось і не. Цяпер яны зноў на хвалі папулярнасці. Па ўсім свеце бібліятэкі пертвараюцца з нудных пыльных сховішчаў у мадэрнізаваныя прасторы з садамі на даху, паркамі, верандамі, гульнявымі памяшканнямі, падлеткавымі цэнтрамі, кінатэатрамі, мастацкімі галерэямі, рэстаранамі і шмат чым іншым.**

Многія бібліятэкі наймаюць найлепшых архітэктараў для стварэння неверагодных дызайнаў. Новыя будынкіператвараюць гарадскі ландшафт, узрываюць сацыяльныя сеткі і прыцягваюць турыстаў з усяго свету.

Прапануем вам караценькую прагулку па дзевяці дужа цікавых бібліятэках.

### Новая цэнтральная бібліятэка Калгары (Канада)

Праз Новую цэнтральную бібліятэку Калгары наскрозь праходзіць цягнік. Уявіце сабе бібліятэку ў якой вестыбюль − гэта арачны мост, пад якім праходзяць лакаматывы. Бібліятэка адкрылася ў лістападзе летась і была пабудавана на змену ўжо існуючага філіялу гарадской бібліятэкі.

Бібліятэка ператвараецца з "вясёлай" у "сур'ёзную", калі наведвальнікі падымаюцца па вінтавой лесвіцы. На ніжніх паверхах − дзве кавярні, падлеткавы цэнтр, дзіцячая прастора і кінатэатр на 320 месцаў. Найвышэйшы паверх − вялікая чытальная заля, больш традыцыйная бібліятэчная прастора, акружаная драўлянымі дошкамі.




*Новая цэнтральная бібліятэка Калгары, Канада*

## Хельсінская цэнтральная бібліятэка Oodi (Фінляндыя)

Пабудова гэтай бібліятэкі была прымеркавана да стагоддзя незалежнасці Фінляндыі ад Расійскай імперыі. Завецца яна Oodi па-фінску і Ode па-шведску, што ў перакладзе значыць "ода". Фасад бібліятэкі – амаль цалкам яловы. Фінская яліна на фасадзе змешана са сталлю і шклом − усё гэта разам стварае просты, чысты і прыемны сваёй мінімалістычнасцю выгляд бібліятэкі.

Толькі траціна будынку выкарыстоўваецца для захоўвання кніг – астатняя частка адведзена пад грамадскую прастору, для сустрэч ці крэатыўнай працы. На апошнім паверсе наведвальнікі апынаюцца ў амаль што цалкам драўляным асяроддзі і маюць магчымасць утульна паляжаць на ваўняных дыванах. На другім паверсе ёсць майстэрня са швейнымі машынамі, сканерамі і прынтарамі, лазернымі разцамі і паяльнымі станцыямі.

Ёсць і месца, дзе прадпрымальнікі могуць здымаць у арэнду працоўныя месцы для сустрэч з калегамі ці кліентамі.




*Бібліятэка Oodi, Хельсінкі, Фінляндыя*

### Музей літаратуры ў Дубліне (Ірландыя)

У цэнтральным парку Дубліна ёсць тры вялікія будынкі з XVII стагоддзя, адзін з якіх быў пабудаваны вядомым у свой час архітэктарам Рычардам Касэлсам. Раней гэтыя будынкі належалі Дублінскаму ўніверсітэцкаму каледжу, дзе вучыліся шмат якія з найбольш вядомых пісьменнікаў Ірландыі. Гэтыя будынкі стануць часткаю новага Музея літаратуры Ірландыі і будуць упершыню адкрыты для грамадскасці 20 верасня сёлета.

Наведвальнікі змогуць убачыць колішнюю аўдыторыю для лекцый па фізіцы (у якой адбываюцца падзеі аднаго з раздзелаў рамана "Партрэт мастака ў маладосці" Джэймса Джойса) і першы надрукаваны асобнік "Уліса". Акрамя шматлікіх экспанатаў, прысвечаных гэтаму вядомаму ірландскаму пісьменніку, у бібліятэкі будзе свая радыёстанцыя, якая будзе весці трансляцыю 24 гадзіны ў суткі, сем дзён на тыдзень.




*Панарама Дубліна*

### Катарская нацыянальная бібліятэка (Доха)

Распрацавана вядомым нідэрландскім архітэктарам Рэмам Кулхасам, Нацыянальная бібліятэка Катара адкрылася ў 2018 годзе. Высокая столь амаль цалкам выканана са шкла – гэта сімвалізуе тое, якое важнае значэнне святло мае для навучання.

Выдзеленая "Бібліятэка спадчыны" складаецца з 11 пакояў, у якіх захоўваюцца важныя для Катара і ўсяго рэгіёна дакументы, выданні і артэфакты. Гэтая частка бібліятэкі як быццам тоне на 2 метры ў зямлю, ствараючы візуальнае падабенства з археалагічнымі раскопкамі.

Кожны месяц у бібліятэцы для публікі бясплатна выступае Катарская філармонія. Гэта толькі адно з 80–90 бясплатных мерапрыемстваў, якія бібліятэка штомесяц праводзіць. Адным з самых папулярных бясплатных заняткаў з'яўляюцца групы па вязанні. Ёсць студыі для запісу музыкі, тэлевізійныя студыі з зялёнымі экранамі, а таксама памяшканні для дзяцей усіх узростаў.




*Будынак Нацыянальнай бібліятэкі Катара*

## Бібліятэка Біньхай (Кітай)

Бібліятэка адкрылася ў кастрычніку 2017 года і мае ўсё, чаго можна чакаць ад бібліятэкі: чытальныя залі, памяшканні для навучання, сховішча кніг і вялікі архіў. Але большасць гасцей не цікавіцца функцыянальнасцю бібліятэкі − яны прыязджаюць з усяго свету, каб паглядзець фантастычную архітэктуру. Менавіта з прычыны свайго незвычайнага дызайну бібліятэка стала папулярным месцам для сэлфі і пастоў у Instagram’е.

Прастора плошчай у 35 тысяч квадратных метраў афарбаваная ад падлогі да столі ў чысты белы колер. У цэнтры знаходзіцца сферычная аглядальная зала з назвай "Вока". Вакол "Вока" можна пабачыць белыя паліцы ад падлогі да столі, якія сабою імітуюць форму хвалі. У памяшканні таксама ёсць дзве пляцоўкі на даху, з якіх адкрываецца цудоўны від на наваколле.




*Бібліятэка Цяньцзіня Біньхай, Кітай*

**Цэнтральная бібліятэка (Остын, ЗША)**

Цэнтральная бібліятэка ў Остыне, штат Тэхас, уражвае не толькі сваімі памерамі і прасторнасцю, але і прагрэсіўнасцю. Бібліятэка выбраляе ўласную сонечную энергію, якая забяспечвае 30 % энергетычных патрэб будынка. Там ёсць нават "насенная бібліятэка", дзе карыстальнікі могуць узяць зярняткі і пасадзіць іх дома.

Адна з найбольш уражальных асаблівасцей бібліятэкі – гэта "тэхналагічны заапарк", дзе наведвальнікі могуць гуляць з новымі гаджэтамі, якіх у іх пакуль няма (а можа і не будзе). Яны, прыкладам, могуць маляваць на планшэтах, стварыць уласную мадэль на 3D-прынтары альбо запісаць песню.



*Цэнтральная бібліятэка, Остын, Тэхас*

**Бібліятэка Дэйхмана (Осла, Нарвегія)**

Адкрыццё новага філіяла Бібліятэкі Дэйхмана (гарадской бібліятэкі Осла) у квартале Б’ёрвік запланаванае на вясну 2020 года. З бібліятэкі будзе адкрывацца цудоўны від на Осла, фіёрды і зялёныя ўзгоркі сталіцы. У бібліятэкі будуць таксама размяшчацца вялікі кінатэатр і гульнявая зона (адзін са спосабаў завабіць падлеткаў). Памяшканне, у якім захоўваюцца "сакрэтныя рукапісы", не будзе адчыненае аж да 2114 году − Бібліятэка Дэйхмана бярэ ўдзел у праекце "Бібліятэка Будучыні", задуманым мастачкай Кэйты Патэрсан.




*Панарама Осла*

**Нацыянальная бібліятэка, Клементынум**

Нацыянальная бібліятэка − адна з найбуйнейшых і найстарэйшых еўрапейскіх бібліятэк, якая захоўвае больш за шэсць мільёнаў дакументаў. Прыгожая барочная заля была пабудавана ў 1722 годзе і ўпрыгожана дзіўнымі фрэскавымі карцінамі. У цэнтры залі барочнай бібліятэкі можна ўбачыць дзівосную калекцыю глобусаў, створаную езуітамі.




*Чэшская нацыянальная бібліятэка, Клементынум, Прага*

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі (Мінск)**

І апошняя, але не па важнасці, Нацыянальная бібліятэка Беларусі – 23-павярховы беларускі "алмаз" альбо ромбакубаактаэдр. Яна была пастаўлена на 11-е месца ў рэйтынгу найпрыгажэйшых бібліятэк паводле версіі амерыканскага выдання Flavorwire у 2013 годзе. Новы будынак абсталяваны аўтаматызаванай сістэмай дастаўкі літаратуры "тэлеліфт", які складаецца з монарэек і кантэйнераў грузападымальнасцю ад 5 да 10 кг. Падсвятленне будынка ўяўляе сабой шматколерны экран плошчай 1985 квадратных метраў, які ўключаецца штодня з захадам сонца і працуе да поўначы.




*Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Мінск*